УДК 902(476)

***В.Ю. Піліповіч*[1]*, А.А. Дацкевіч*[2]**

*[1]магістр гіст. навук, выкладчык каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
*[2]магістрант каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ПОМНІКІ МАЛАРЫТЧЫНЫ

*Артыкул прысвечаны агляду археалагічных старажытнасцяў Маларыцкага раёна. Прыводзіцца апісанне выяўленых помнікаў у кантэксце археалагічных эпох, перыядаў і культур. Даследаванне грунтуецца на апублікаваных матэрыялах археалагічнага вывучэння рэгіёна, а таксама выніках гісторыка-краязнаўчых экспедыцый 2014–2015 гг. Падкрэсліваецца фрагментарнасць ведаў па стражытнай гісторыі Маларыцкай зямлі. Акцэнтуецца ўвага на неабходнасці сістэмнага археалагічнага даследавання Маларытчыны.*

## Уводзіны

Сістэмнае даследаванне археалагічных помнікаў дазваляе аднавіць гісторыю старажытных эпох пэўнага рэгіёна. Маларыцкі раён вельмі слаба даследаваны археалагічна. На яго тэрыторыі амаль не праводзіліся археалагічныя раскопкі. Аб старажытным мінулым края можна меркаваць толькі па матэрыялах археалагічных разведак і асобных знаходках артэфактаў. Археалагічных помнікаў вядома няшмат, тым не менш яны прадстаўляюць усе гістарычныя эпохі: каменны век (палеаліт, мезаліт, неаліт), бронзавы век, жалезны век і сярэднявечча. З дапамогай гэтых помнікаў можна часткова рэканструяваць дапісьменную гісторыю Маларыцкай зямлі.

## Першыя насельнікі Маларытчыны (фінальны палеаліт)

Найбольш старажытныя сляды пражывання чалавека на тэрыторыі Маларыцкага раёна адносяцца да эпохі фінальнага палеаліта. Помнік гэтага часу зафіксаваны каля в. Арэхава. Ён адносіцца да свідэрскай археалагічнай культуры, якая працягвала сваё існаванне яшчэ ў раннім мезаліце. Плямёны свідэрскай культуры былі найбольш старажытным насельніцтвам Маларытчыны. Асновай іх гаспадаркі было паляванне і збіральніцтва [1, с. 32–34; 2, с. 29]. Свідэрскія плямёны жылі ў басейне Віслы (Польшча), а таксама на Панямонні, Палессі і Падняпроўі (Беларусь). Свідэрская культура сваю назву атрымала ад помніка Свідры-Вельке, які быў выяўлены на тэрыторыіі Польшчы на месцы ўпадзення Свідэры ў Віслу. У навуцы ёсць праблема паходжання дадзенай культуры. Паводле радыёвугляроднага аналізу яна павінна была існаваць прыкладна 10 800–9 800 гадоў таму назад [3, с. 282–283].

## Археалагічныя помнікі мезалітычнага часу

У эпоху мезаліта землі Маларытчыны ўваходзілі ў арэал (зону распаўсюджання) яніславіцкай археалагічнай культуры. Археолагамі былі выяўлены рэшткі стаянкі носьбітаў яніславіцкай культуры каля в. Арэхава. Яніславіцкая культура храналагічна адносіцца да познага мезаліту (6–5 тысячагоддзе да н.э.). Помнікі гэтай культуры выяўлены ў басейнах Віслы, Нёмана, Прыпяці і Верхняга Дняпра. Назва ўтворана ад помніка Яніславіцы (Польшча). Сярод помнікаў культуры вядомы стаянкі і пахаванні па абрадзе трупапалажэння ў грунтавых ямах выцягнутай формы. Інвентар у асноўным прадстаўлены вырабамі з крэменю і косткі. Паляванне, збіральніцтва і рыбалоўства былі асноўнымі заняткамі яніславіцкага насельніцтва. Магчыма, носьбіты яніславіцкай культуры прынялі ўдзел у фарміраванні прыпяцка-нёманскай (валынскай) культуры эпохі неаліту [4, с. 449–451; 6, с. 18].

**Помнікі неалітычнай эпохі**

У перыяд сярэдняга і позняга неаліту тэрыторыя Маларыцкага раёна была заселена плямёнамі нёманскай археалагічнай культуры (4 – пач. 2 тысячагоддзя да н.э.). Яе носьбіты жылі на захадзе Беларусі, у сярэдняй і ўсходняй Польшчы, а таксама на паўднёвым захадзе Літвы. Культурныя ўплывы нёманскага насельніцтва сягалі паўночнай Валыні, цэнтральных раёнаў Беларусі, а на захадзе – да нізоўяў Одэра. Насельніцтва нёманскай культуры займалася паляваннем, збіральніцтва, рыбалоўствам, а таксама пачало асвойваць земляробства і жывёлагадоўлю. Крэмень здабываўся метадам адкрытых выпрацовак. Жытлы былі наземныя, размяшчаліся на берагах вадаёмаў. У пачатку 3 тысячагоддзя да н.э. нёманскае насельніцтва засяліла захад Беларусі, дзе змяшалася з носьбітамі прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры. Нёманская культура на тэрыторыі Беларусі прайшла два этапы. Ранні (лысагорскі) этап культуры сфарміраваўся пад уздзеяннем культуры лейкападобных кубкаў, а позні (дабраборскі) звязваецца з уплывамі культуры шарападобных амфар і культуры шнуравой керамікі [5, с. 132]. Сляды пасялення культуры лейкападобных кубкаў на тэрыторыі Маларытчыны былі выяўлены ў 1930 г. польскім краязнаўцам К. Пшэмыскім каля былога хутара Цытылле непадалёк ад Хаціслава [6, с. 18, 108]. Культура лейкападобных кубкаў існавала ў 5–3 тысячагоддзях да н.э. Прадстаўнікі гэтай супольнасці патрапілі сюды з захаду. Сваю назву культура атрымала з-за найбольш характэрнага тыпу глінянага посуду – кубка з высокай шыйкай, форма якога нагадвае лейку [7, с. 11].

Каля в. Мікольскае ў 1950-я гг. М. Алексяюком была адкрыта неалітычная стаянка. Знойдзена невялікая колькасць крамянёвых прылад працы, якія захоўваюцца ў фондах Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. У 1964 г. У. Ісаенка падчас археалагічнага абследавання тэрыторыі Маларыцкага раёна каля в. Замшаны выявіў сляды старажытнага паселішча каменнага веку. Помнік размяшчаецца на левым беразе р. Рыта на паўночны захад ад аўтадарогі Маларыта – Кобрын. Стаянкі неалітычнай эпохі выяўлены таксама каля вёсак Лукава і Арэхава [6, с. 17–18, 106]. Фінальны неаліт стаў пачаткам імклівых зменаў у этнічным складзе насельніцтва. На тэрыторыі, заселеныя плямёнамі нёманскай культуры, прыходзіць хваля новых плямёнаў. На вялікіх абшарах Еўропы ад Рэйна да Волгі фарміруецца кола культур шнуравой керамікі, якое існавала ў познім неаліце (раннім бронзавым веку, паводле ўсходнееўрапейскай перыядызацыі). Носьбітаў гэтых культур даследчыкі несумненна адносяць да індаеўрапейцаў. Частка навукоўцаў лічыць, што людзі, якія ўтварылі кола культур шнуравой керамікі, прыйшлі з Паўночнага Прычарнамор’я [8, с. 427–428].

**Помнікі бронзавага веку**

Шнуравікі не выціснулі нёманцаў з іх тэрыторый. Прышэльцы пачалі суіснаваць і змешвацца з абарыгенным насельніцтвам. У выніку гэтага ўзаемадзеяння ў сярэдняй бронзе ўзнікае тшцінецкая археалагічная культура, якая лакалізавалася на тэрыторыях сучасных Польшчы, Беларусі, Украіны і існавала на даволі вялікіх абшарах. Матэрыял эпохі бронзы прадстаўлены ў асноўным выпадковымі знаходкамі [2, с. 30], большасць якіх захоўваецца ў школьных музеях або ў прыватных калекцыях і не ўведзена ў навуковы ўжытак.

**Помнікі жалезнага веку**

Эпоха жалеза на Беларусі доўжылася з канца VII–VI ст. да н.э. да V ст. н.э. [9, с. 335]. Па звестках Л.Д. Побаля, паблізу населеных пунктаў Арэхава, Вялікарыта, Гусак, Закруцін і Лукава сабрана кераміка петрыкоўскай культуры. Акрамя таго, каля вёсак Арэхава, Лукава і ракі Рыты (ля Замшан) была выяўлена кераміка ранняга этапа зарубінецкай культуры [10, с. 109–110]. Зарубінецкая культура была распаўсюджана

ў Сярэднім і Верхнім Падняпроўі і Прыпяцкім Палессі. Назва культуры ўтворана ад могільніка каля сяла Зарубінцы на Кіеўшчыне. Асновай гаспадаркі зарубінецкага насельніцтва было земляробства і жывёлагадоўля. Вырошчвалі проса, пшаніцу, ячмень і гарох. Яшчэ займаліся паляваннем і рыбалоўствам. Металаапрацоўка і вытворчасць керамікі дасягнулі дастаткова высокага ўзроўню. Зарубінецкая супольнасць мела племянную арганізацыю, а яе аснову складала малая сям'я. На Маларытчыне быў распаўсюджаны палескі варыянт зарубінецкай культуры. Будаваліся паўзямляначныя жытлы са зрубавай канструкцыяй. Хаты ацяпляліся глінабітнымі печкамі або агнішчамі. Этнічная прыналежнасць зарубінцаў з'яўляецца спрэчнай [11, с. 355–357].

**Сярэднявечча**

Новая эпоха – сярэднявечча – наступае на Беларусі з VII ст. н.э. [12, с. 340]. Пачынаюць шырока распаўсюджвацца курганныя пахаванні. У VIII–X стст. Маларытчына ўваходзіла ў арэал лука-райкавецкай культуры, якая склалася на аснове пражскай культуры [13, с. 28]. У VI – IX стст. на землях Беларускага і Украінскага Пабужжа існаваў племянны саюз дулебаў. У першай палове VII ст. дулебы вялі барацьбу з ваяўнічымі качэўнікамі аварамі (обрамі), якія аселі на тэрыторыі сучаснай Венгрыі і стварылі сваю дзяржаву – Аварскі каганат. Авары прыгняталі дулебаў, пра што ўпамінаецца ў Аповесці мінулых гадоў. Існуе думка, што ў пазнейшы перыяд гэтае аб'яднанне распалася на бужан (валынян), дрыгавічоў і драўлян [14, с. 328]. Найбольш верагодна, Маларыцкі раён у раннім сярэднявеччы ўваходзіў у зону рассялення валынян [15, с. 34].

Самымі прыкметнымі помнікамі ранняга сярэднявечча з'яўляюцца курганы. Вядома пра існаванне каля пяці курганных могільнікаў на тэрыторыі Маларытчыны. Курганы вядомы каля наступных населеных пунктаў: Радзеж (Пяртышча), Закруцін (Масевічы), Струга, Антанова і, верагодна, Яміца. Не ўсе яны захаваліся да сённяшняга дня. Часцей за ўсё курганы разбураліся падчас сельскагаспадарчых або будаўнічых работ, значную шкоду ім прыносяць скарбашукальнікі, ці «чорныя археолагі».

У 1895 г. археолагам Ф.В. Пакроўскім была выдадзена «Археологическая карта Гродненской губернии», дзе была змешчана інфармацыя аб дзвюх курганных групах каля в. Радзеж (цяпер Олтушскі сельсавет). Па звестках Ф.В. Пакроўскага, адна група курганаў знаходзілася на невялікім астраўку пасярод балота ва ўрочышчы Збышча, а другая група непадалёк, ва ўрочышчы Крэў. Першая група курганаў налічвала 5 насыпаў, а другая 3. Археолаг адзначыў, што народнае паданне звязвае гэтыя курганы з вайной шведаў з Ардой. У 1882 г. адзін з курганаў быў раскапаны адстаўным капітанам М. Лукаўцом. У насыпу былі выяўлены рэшткі памосту з бярозавага бярвення, аднак на гэтым раскопкі былі прыпынены. Па іншых звестках, у кургане, акрамя бярвення, было знойдзена «несколько ножей и некоторое подобие штыка» [16, с. 79–80]. У 1961 г. В.В. Сядоў абследаваў месца могільніка, аднак курганныя насыпы былі ўжо цалкам разараныя [17, с. 24, 239]. Летам 2014 г. падчас гісторыка-этнаграфічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна было высветлена, што курганы размяшчаліся ў паўночным накірунку ад в. Радзеж на паўднёвай ускраіне в. Пяртышча. Пры апытанні мясцовага насельніцтва ў в. Пяртышча было запісана народнае паданне аб курганах, удакладнены назвы тапонімаў. Напрыклад, назва ўрочышча «Крев», якое прыводзіць Ф.В. Пакроўскі, па сведчаннях мясцовых жыхароў, на самой справе называецца «Кря» [18].

Каля станцыі Закруцін (Вялікарыцкі сельсавет) у накірунку в. Масевічы знаходзіцца 9 курганаў. Могільнік быў выяўлены і зафіксаваны В.В. Сядовым у 1961 г. У 1970 г. курганы былі абследаваны П.Ф. Лысенкам. Раскопкі курганаў не праводзіліся [19, с. 302].

Курганы каля в. Струга (Вялікарыцкі сельсавет) былі адкрыты ў 1980 г. у выніку археалагічнай разведкі, якая была праведзена С.М. Васільевай. Могільнік размяшчаец-

ца ў 7 км на паўночны захад ад вёскі сярод леса ва ўрочышчы Крыж непадалёк ад былога хутара Халстынова і налічвае 7 курганных насыпаў. У 1982, 1983 і 1985 гг. могільнік даследаваўся Т.М. Каробушкінай. У 1983 г. адзін з курганаў быў ёю раскапаны. Пахавальны абрад – трупаспаленне (крэмацыя) па-за межамі кургана. Могільнік датуецца IX–X стст. Матэрыялы з раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі [20, с. 129–130].

У 3-х км на паўночны захад ад в. Антанова (Вялікарыцкі сельсавет) ва ўрочышчы Панскае размешчана 6 курганаў X–XIII стст., якія вядомы сярод мясцовага насельніцтва пад назваю «шкапцы». Могільнік быў выяўлены і абследаваны ў 1983 г. Т.М. Каробушкінай. Археалагічныя раскопкі не праводзіліся [20, с. 129].

Па звестках У.Ф. Ісаенкі ў наваколлі в. Яміца знаходзіцца група курганаў [2, с. 30].

Па сведчаннях старажылаў, запісаных у 2015 г. падчас гісторыка-этнаграфічнай экспедыцыі, каля в. Вялікарыта на пяшчаным узвышшы левага берага Рыты ў другой палове XX ст. мясцовае насельніцтва часта знаходзіла круглыя пацеркі розных колераў, а таксама металічныя вырабы ў выглядзе крыжыкаў. Гэтае месца не пакідаюць без увагі і «чорныя капацелі» [21; 22]. Пяшчанае ўзвышша, дзе мясцовыя жыхары таксама знаходзілі пацеркі, было і на паўночным захадзе ад в. Ляхаўцы, але цяпер амаль цалка зрыта для будаўнічых патрэб. Ад знішчанага ўзвышша на паўднёвы захад уздоўж аўтадарогі Ляхаўцы – Маларыта цягнуцца доўгім ланцужком іншыя пяшчаныя ўзгоркі [23]. Сабраная звесткі сведчыць, што каля вёсак Вялікарыта і Ляхаўцы, верагодна, існуюць ці існавалі рэшткі старажытных могільнікаў. Магчыма, гэта сляды курганных пахаванняў ранняга сярэднявечча ці безкурганныя могільнікі эпохі жалеза. Аднак не выклікае сумнення, што атрыманая інфармацыя заслугоўвае ўвагі вучоных-археолагаў.

Людзі, якія пакінулі курганы, жылі на неўмацаваных селішчах. І сёння на Маларытчыне можна сустрэць не адно ўрочышча, якое мае назву «Сэлышча». Урочышчы з такой назвай існуюць каля вёсак Дарапеевічы, Масевічы і Ляхаўцы. Такія тапонімы з’яўляюцца прыкметай магчымага існавання старажытных паселішчаў. Рэшткі селішчаў ранняга сярэднявечча, згодна У.Ф. Ісаенкі, вядомы каля вёсак Арэхава, Дубічна, Лукава і Олтуш [2, с. 30]. Умацаваных паселішчаў – гарадзішчаў – на тэрыторыі раёна не вядома. Найбліжэйшае да Маларытчыны гарадзішча размяшчаецца ў ніжнім цячэнні р. Рыты каля в. Франопаль (Брэсцкі раён).

Пасля прыняцця хрысціянства кіеўскім князем Уладзімірам у 988 г. на працягу ўсяго ранняга сярэднявечча (VII–XIII стст.) на тэрыторыі Беларусі сельскае насельніцтва ўсё яшчэ заставалася пераважна язычніцкім. Хрысціянства прыйшло толькі ў гарады і павольна распаўсюджваецца ў навакольныя вёскі. Месцамі рэлігійнага культу старажытнага насельніцтва Маларытчыны былі свяцілішчы – дахрысціянскія культавыя збудаванні, дзе паганцы маліліся і рабілі ахвярапрынашэнні багам [24, с. 286]. На тэрыторыі раёна вядомы шэраг такіх сакральных аб’ектаў. Захавалася два камяні-следавікі. Адзін камень-следавік зараз захоўваецца ў царкве в. Лукава. Раней ён ляжаў побач са старой царквой на паўвыспе на беразе Лукаўскага возера. Другі камень, паводле звестак, атрыманых ад мясцовых жыхароў, знаходзіцца каля в. Ацяты ва ўрочышча Папова Дуброва [25].

Ф.В. Пакроўскі ў сваёй археалагічнай карце змясціў апісанне каменя вялікага памеру: «В 10 верстах от с. Радежа, при проселочной дороге из дер. Богуславки в поселок Отятые, лежит громадный камень, от которого и вся, прилегающая к нему, местность получила название “Камень”. Камень этот имеет в длину 4 арш., в ширину $3^{1}/_{4}$ арш. и в вышину (считая подземную его часть), по словам крестьян, более двух сажней; кругом окопан» [16, с. 80]. Урочышча Камень, якое знаходзіцца паміж вёскамі Ацяты і Хмялёўка, добра вядома мясцоваму насельніцтву і сёння, яно нават пазначана на сучаснай геаграфічнай карце Маларыцкага раёна. У 2015 г. падчас гісторыка-краязнаўчай экспе-

дыцыі з дапамогай жыхара в. Ацяты былі выяўлены рэшткі каменя, якія прыгадаў Ф.В. Пакроўскі. Камень быў узарваны па загадзе старшыні калгаса некалькі дзесяцігоддзяў назад. Пасля выбуху ад каменя засталося толькі тры вялікія фрагменты. Апісанне каменя, атрыманае ад мясцовага насельніцтва, супадае з дадзенымі Ф.В. Пакроўскага. Старажылы ўспамінаюць, што камень быў амаль круглай формы, пляскаты, меў шчарбатую паверхню, на ім мелася паглыбленне ў выглядзе жалабка, вакол каменя існаваў кальцавы равок. Пра камень было запісана паданне, якое ўтрымлівае элементы міфалагічных уяўленняў [25]. Гэтыя факты сведчаць на карысць таго, што ва ўрочышчы Камень існавала язычніцкае свяцілішча.

Каля паўночнага берага Арэхаўскага возера на 1,2–1,5 м над паверхняй вады таксама ўзвышаецца вялікі камень. Пра гэты камень сярод мясцовага насельніцтва вядома паданне [25]. На думку археолага У.Ф. Ісаенкі, камень-валун з'яўляецца часткай былога капішча [2, с. 30].

Прыблізна на рубяжы XIII і XIV стст. раннесярэднявечны перыяд змяняецца познесярэднявечным. У беларускай археалогіі прынята лічыць познесярэднявечнымі тыя помнікі, якія фарміраваліся ад XIV ст. да XVIII ст. уключна [12, с. 340]. З пункту гледжання гісторыі ў гэтых межах аб'яднаны дзве эпохі: уласна позняе сярэднявечча і ранні новы час. У гэты перыяд амаль усе беларускія землі ўваходзілі ў Вялікае Княства Літоўскае. На Маларытчыне археалагічныя помнікі гэтага часу ўвогуле не даследаваліся. Познесярэднявечнымі помнікамі можна лічыць царкоўныя цвінтары, могільнікі, шляхецкія двары і сядзібы, прамысловыя прадпрыемствы (рудні, гуты і інш.), а таксама паселішчы. Месцазнаходжанне апошніх амаль дакладна адпавядае сучасным населеным пунктам, акрамя ўтвораных у апошнія стагоддзі. Напрыклад, археалагічныя раскопкі царкоўных цвінтароў, магчыма, маглі б адказаць на пытанні, калі хрысціянства пачало распаўсюджвацца ў сельскай мясцовасці і калі былі пабудаваныя першыя цэрквы. Вывучэнне познесярэднявечных могільнікаў таксама выклікае інтарэс, нягледзячы на іх амаль поўную безынвентарнасць. Адсутнасць інвентару ў магілах звязана з замацаваннем хрысціянскага абраду пахавання нябожчыкаў. Існуюць цяжкасці з выяўленнем такіх могільнікаў на Маларытчыне, бо амаль адсутнічаюць іх знешнія прыкметы. З-за нешматлікасці на тэрыторыі раёна камянёў вялікага памеру надмагільныя знакі рабіліся як правіла з дрэва, таму яны і не захаваліся. Напрыклад, на ўскрайку в. Дарапеевічы ва ўрочышчы «Пад Камнем», магчыма, размяшчаецца познесярэднявечны могільнік, на якім сёння стаіць камень у форме крыжа. На камені выбіты чатырохканцовы крыжык. Упершыню камень-крыж быў зафіксаваны Гродзенскім губернскім статыстычным камітэтам. Адзначалася, што камень сваёй формай нагадвае чалавека [17, с. 24; 238]. Мясцовыя жыхары згадваюць, што падчас сельскагаспадарчых работ каля крыжа выворваліся чалавечыя косткі, што і наводзіць на думку аб існаванні познесярэднявечных могілак. Трэба адзначыць, што гэты камень-крыж сапраўды мае пэўныя антрапаморфныя рысы. Нельга таксама выключаць, што гэты камень калісці быў паганскім ідалам, якому з прыходам храсціянства надалі выгляд крыжа. Летам 2014 г. пра гэты камень было запісана цікавае паданне [27].

Даволі багаты матэрыял аб сярэднявечнай культуры могуць даць раскопкі шляхецкіх сядзіб XVI–XVIII стст. Шляхецкія маёнткі, паводле пісьмовых крыніц, на тэрыторыі Маларытчыны з'яўляюцца ў XVI ст. Самыя першыя шляхецкія двары паявіліся ў Пажэжыне і Макранах [28, с. 143, 221, 226]. Пра іх дакладную лакалізацыю мы нічога сказаць не можам. На Беларусі пры археалагічных раскопках шляхецкіх сядзіб найбольш шматлікім археалагічным матэрыялам з'яўляецца кераміка. Гэта разнастайныя віды посуду (патэльні, збанкі, міскі, рынкі і інш.), але самай яскравай прыкметай познесярэднявечнай эпохі з'яўляецца пячная кафля. На Беларусі яна з'яўляецца ў пачатку XIV ст. Сустракаюцца разнастайныя вырабы з металаў і шкла. Трапляюцца і манеты,

якія могуць даць датыроўку культурнага слоя. Асобную групу археалагічных помнікаў складаюць рэшткі гутаў, рудняў, вадзяных млыноў і іншых прамыслова-гаспадарчых аб’ектаў (на тэрыторыі Маларыцкага раёна ў розныя часы існавала некалькі гутаў).

**Заключэнне**

Такім чынам, кароткі агляд археалагічных старажытнасцяў Маларыцкага раёна дае ўяўленне аб разнастайнасці помнікаў археалогіі. Неабходна адзначыць, што стацыянарныя раскопкі на тэрыторыі раёна амаль не праводзіліся; мясцовасць часткова абследаваная шляхам археалагічных разведак. Інфармацыя аб некаторых помніках захоўваецца ў мясцовых краязнаўцаў, а пад’ёмны матэрыял (артэфакты) складаюць фонды школьных музеяў ці прыватныя калекцыі. Недастатковасць археалагічнага вывучэння стварае «белыя плямы» у гісторыі рэгіёна, прыводзіць да блытаніны і памылак даследчыкаў пры інтэрпрытацыі матэрыялаў. Асаблівы інтарэс выклікае магчымасць археалагічнага вывучэння тарфянікаваых стаянак на тэрыторыі раёна, што магло б даць багаты матэрыял аб жыцці старажытнага насельніцтва Маларытчыны, а таксама магло б дапамагчы адказаць на пытанне, калі на Беларусі з’явіліся першыя земляробы і жывёлаводы. Раскопкі курганаў, магчыма, вырашылі б пытанне этнічнай прыналежнасці жыхароў поўдня Беларускага Пабужжа ў раннім сярэднявеччы. Відавочна, Маларыцкая зямля патрабуе грунтоўнага археалагічнага вывучэння, ад якога можна чакаць даволі цікавых археалагічных адкрыццяў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Вяргей, В. Старажытная гісторыя Камянецкага раёна па археалагічным даным / В. Вяргей // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Камянецкага раёна. – Мінск : Ураджай, 1997. – С. 29–45.
2. Ісаенка, У. Ф. Пра што расказваюць курганы / У. Ф. Ісаенка // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Маларыцкага раёна. – Мінск: Ураджай, 1998. – С. 28–30.
3. Калечыц, А. Г. Свідэрская культура / А. Г. Калечыц // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 282–283.
4. Коласаў, А. У. Яніславіцкая культура / А. У. Коласаў // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 449–451.
5. Чарняўскі, М. М. Нёманская культура / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 132.
6. Исаенко, В. Ф. Археологическая карта Белоруссии / В. Ф. Исаенко. – Минск : Полымя, 1968. – Вып. I : Памятники каменного века. – 125 с.
7. Крывальцэвіч, М. М. Лейкападобных кубкаў культура / М. М. Крывальцэвіч // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 11.
8. Крывальцэвіч, М. М. Шнуравой керамікі культура / М. М. Крывальцэвіч // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 427–429.
9. Егарэйчанка, А. А. Жалезны век / А. А. Егарэйчанка // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2009. – Т. 1. – С. 334–335.
10. Поболь, Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л. Д. Поболь. – Минск : Наука и техника, 1983. – 455 с.

11. Бяліцкая, Г. М. Зарубінецкая культура / Г. М. Бяліцкая // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2009. – Т. 1. – С. 355–360.

12. Калядзінскі, Л. У. Сярэдневякоўе / Л. У. Калядзінскі // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 340.

13. Вяргей, В. С. Лука-райкавецкая культура / В. С. Вяргей // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 28.

14. Штыхаў, Г. В. Дулебы / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2009. – Т. 1. – С. 328.

15. Іоў, А. В. Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X–XIII стст. (па матэрыялах сельскіх паселішчаў) / А. В. Іоў // Старонкі гісторыі Беларусі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 25–36.

16. Покровский, Ф. Археологическая карта Гродненской губернии / Ф. Покровский. – Вильна, 1895. – 165 с.

17. Штыхов, Г. В. Археологическая карта Белоруссии / Г. В. Штыхов. – Минск : Полымя, 1971.– Памятники железного века и эпохи феодализма. – Вып. 2 : 274 с.

18. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з С. Р. Піпко. – в. Пяртышчы. – 2014, ліпень.

19. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск : БелСЭ, 1990. – 424 с.

20. Коробушкина, Т. Н. Курганы Белорусского Побужья X–XIII вв. / Т. Н. Коробушкина. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 133 с.

21. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з Н. – в. Печкі. – 2015, чэрвень.

22. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з М. – в. Гусак. – 2015, чэрвень.

23. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з В.Я. Бурштын. – в. Ляхаўцы. – 2015, ліпень.

24. Дучыц, Л. У. Свяцілішчы / Л. У. Дучыц, Э. М. Зайкоўскі, Э. А. Ляўко // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 286–287.

25. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з У.А. Хатынюк. – в. Ацяты. – 2015, ліпень.

26. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з В.І.Хатынюком. – в. Ацяты. – 2015, ліпень

27. Асабісты архіў аўтара. Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай экспедыцыі ў Маларыцкі раён. Інтэрв'ю з Г.І Раманюк. – в. Дарапеевічы. – 2014, ліпень

28. Вялікі гістарычны атлас Беларусі : у 3 т. – Мінск : Белкартаграфія, 2009. – Т. 1. – 244 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 25.09.2015

***Pilipovich V.Yu., Datskevich A.A.*** **The Archaeological Sites of Malorita District**

*The article is devoted to the archeological survey of Malorita district antiquities. There is a description of different founded monuments which involve different archeological ages, periods and cultures. It is based on published archeological research materials of the region, and on the results of local history expeditions, which were held in 2014–2015. The knowledge fragmentarity concerning ancient history of Maloriia land is highlighted. The accent is centered on the necessity of consistent archeological research of the Malorita lands.*